Штогод **21 лютага** адзначаецца **Міжнародны дзень роднай мовы**. Гэта свята – нагода для носьбітаў любой мовы яшчэ раз задумацца аб лёсе той, адзінай, якую мы завём матчынай, на якой думаем, на якой вымавілі першае слова і на якой размаўлялі нашы продкі.

20 лютага ў **Свіслацкай раённай бібліятэцы** адбыўся **дзень роднай мовы “У спадчыну – добрае, роднае слова”**. У гэты дзень бібліятэкары ў рамках патрыятычнай акцыі “Гавары са мной па-беларуску” віталі чытачоў на беларускай мове, заклікалі чытаць творы беларускіх аўтараў, вялі гутарку пра ўшанаванне роднай мовы і выхаванне пачуцця гонару за сваю мілагучную мову.



Для вучняў 11 класа СШ №2 імя М.П.Масонава цікавым атрымаўся ўрок беларусазнаўства “Люблю цябе, зямлі бацькоўскай слова”. Вядучыя, апранутыя ў нацыянальныя касцюмы, кожнаму, хто заходзіў у залу і прывітаўся на беларускай мове, уручалі картку з літарай, чым і заінтрыгавалі іх. Прысутныя даведаліся аб заснаванні Міжнароднага дня роднай мовы і менавіта чаму ён адзначаецца 21 лютага, уразіла вучняў паданне аб роднай мове паводле твора А.Вольскага, заахвоціла інтэрактыўная гульня “Эрудыты-мовазнаўцы”. У заключэнні ўсе прысутныя выказалі сваю любоў да роднай мовы і склалі з уручаных картак эмблему нашай сустрэчы “Мы шануем родную мову!”.



Пры правядзенні гучных чытанняў “Люблю чытаць на роднай мове” з задавальненнем удзельнікі чыталі на роднай мове вершы, урыўкі з празаічных твораў беларускіх паэтаў і пісьменнікаў.

